Назва ТВП: Рыбгас «Белае»

© С. Левый

Код: BY019

Геаграфічныя каардынаты: 52°18' N 27°39' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Гомельская вобласць: Жыткавіцкі раён

Плошча: 5451 га

Крытэрыі: B2, B3

Нацыянальны прыродаахоўны статус: не мае

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП рэгіянальнай значнасці, утворана ў 1998 годзе

Агульнае апісанне:

Рыбгас "Белае" ўяўляе сабой буйны комплекс вялікіх і малых рыбаразводных сажалак, уся тэрыторыя акружана пойменнымі дубравамі. Сажалкі раздзелены дамбамі, якія параслі лазняком і бярозай, іх агульная плошча складае 1700 гектараў.

Па плошчы пераважаюць вадаёмы, густа зарослыя мазаічнай надводнай расліннасцю, пераважна рагозам. Яны падраздзяляюцца на гадавальныя (3-8 гектараў) і нагульныя (каля 50 гектараў). Сажалкі рыбгаса адрозніваюцца ад натуральных вадаёмаў тым, што на іх маюцца неабмежаваныя запасы ежы для

розных відаў птушак: рыба і штучны камбініраваны корм, які ўжываецца для яе падкормлівання. Асаблівую адметнасць рыбгасу "Белае" прыдаюць навакольныя дубравы.

Тэрыторыя рыбгаса выкарыстоўваецца для прамысловага рыбаводства, гаспадарка ў асноўным спецыялізуецца па вырошчванню карпа.

Асноўныя біятопы:

Лясы – 55%, сажалкі рыбгаса – 30%, іншыя землі – 15%.

Птушкі:

Сажалкі рыбгаса з'яўляюцца буйнейшым у рэгіёне месцам гнездавання, а таксама харчавання многіх відаў вадаплаўных і рыбаядных птушак. Тут адзначана значная для Беларусі колькасць на гняздаванні пар такіх відаў як качка-неразня *Anas strepera,* нырок-сівак *Aythya ferina,* чапля-бугай *Botaurus stellaris*. Амаль усё лета на тэрыторыі трымаюцца каля 40-50 чорных буслоў *Ciconia nigra*. Аднак найбольшую вядомасць рыбгас "Белае" набыў як адзінае на Беларусі месца, дзе гняздуецца рэдкая качка савук-луток *Mergellus albellus*.

Іншыя групы жывел:

не даследваліся.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2000-2010)	Крытерый ТВП
Качка-неразня *Anas strepera*	гн	20-30 п	2008	Э	↔	B2
Нырок-сівак *Aythya ferina*	гн	80-100 п	2008	Э	↓	B3

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2000-2010)	Крытерый ТВП
Нырок белавокі *Aythya nyroca*	гн	0-2 п	2008	П	↓	
Савук-луток *Mergus albellus*	гн	5-10 п	2008	Э	↓	
Гагач чорнаваллёвы *Gavia arctica*	мг	+	2004	П		
Коўра шэрашчокая *Podiceps grisegena*	гн	2-5 п	2008	Э		
Чапля-бугай *Botaurus stellaris*	гн	7 с	2010	Д	↓	
Чапля вялікая белая *Casmerodius albus*	гн	+	2005-2010	П		
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	+	2005-2008	П		
Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*	гн	1 п	2008	П		
Скапа *Pandion haliaetus*	мг	+	2005-2010	П		
Драч *Crex crex*	гн	10 с	2008	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2000-2010)	Крытерый ТВП
Чайка шызая *Larus canus*	мг	+	2005-2010	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

не вызначана.

Пагрозы:

- Ачышчэнне сажалак ад надводнай расліннасці без уліку экалагічных патрабаванняў.
- Павелічэнне колькасці драпежнікаў. Высокая шчыльнасць янотападобнага сабакі, лісіцы, амерыканскай норкі і лясной куніцы з'яўляецца адным з фактараў, якія абмяжоўваюць колькасць большасці відаў вадаплаўных птушак.
- Памяншэнне колькасці штучнага корму, які рассыпаецца па акваторыі для падкормлівання рыбы, прыводзіць да істотнага зніжэння колькасці многіх відаў вадаплаўных птушак.
- Напаўненне сажалак у некаторыя гады ажыццяўляецца позняй вясной, што прыводзіць да затаплення вялікай колькасці гнёздаў.
- Вялікая колькасць драпежных птушак гіне на электрычных правадах са спецыфічным размяшчэннем ізалятараў.

Рэкамендацыі па захаванню:

Захаванне надводнай расліннасці (магчыма часткова), як месц гнездавання шматлікіх відаў птушак, у тым ліку занесенных у Чырвоную кнігу.

Правядзенне мерапрыемств па змяньшэнню колькасці наземных драпежнікаў.

Рэгуляцыя узроўня вады ў сажалках з улікам экалагічных патрабаванняў.

Правядзенне біятэхнічных мерапрыемств для утак-дуплагнёзднікаў.

Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Астроўскі А.А., Дзмітрынок М.Г.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Астроўскі А.А., Дзмітрынок М.Г., Дубовік Д.В., Жураўлёў Д.В., Казулін А.В.)

Складальнікі : Астроўскі А.А., Дмітрынок М.Г.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*